Анатоль Зэкаў

# ГАДЫ МАЕ — МОЙ РОЙ ГУЛЛІВЫ

*Вершы*



***Зэкаў Анатоль Мікалаевіч*** нарадзіўся 20 студзеня 1955 года ў вёсцы Патапаўка Буда-Кашалёўскага раёна. Скончыў гісторыка-філалагічны факультэт ГДУ. Працаваў у гомельскай раённай газеце «Маяк», у Гомельскім райкаме камсамола і ЦК ЛКСМ Беларусі, у рэдакцыях газет «Чырвоная змена», «Добры вечар», «Сталіца», «Книга и мы», «Беларуская лясная газета», часопісаў «Вожык», «Полымя», «Вясёлка», у выдавецтве «Мастацкая літаратура».

Аўтар звыш сарака кніг паэзіі і прозы. Лаўрэат літаратурных прэмій імя Янкі Маўра Мінскага гарадскога аддзялення СПБ і імя Васіля Віткі рэдакцыі часопіса «Вясёлка», прэміі «Залаты Купідон». Ганаровы грамадзянін Буда-Кашалёўскага раёна.

Узнагароджаны медалём Францішка Скарыны.

## ВОЛЯ

Мы — вольныя птушкі, бо воля
штокожнага з нас акрыляе,
бо воля — найлепшая доля,
якая сляпой не бывае.

Мы — птушкі,
За спінамі — крылы,
што ўзносяць да самага неба.
На волю імкнемся штосілы,
бо воля мацнейшая.
Трэба

кагосьці ўжо ў тым пераконваць
і штосьці даказваць бязмежна?..
Уласныя ў волі законы,
бо воля і ёсць незалежнасць.

Пражыць немагчыма без грошай,
без хлеба, вады і без солі,

ды голад наш, пэўна, найгоршы,
калі галадаем па волі.

Мы — вольныя птушкі.
А волю
ніколі не купіш за грошы.
Яна — найвялікшая доля,
якую даруе свет Божы.

## ЗВЕЧАРА НА ПІЛІПАЎКУ

Стынуць травы лугавыя,
і, нябачныя нікім,
на Піліпаўку завыюць
за ваколіцай ваўкі.

А завея ім падвые,
далучыўшы голас свой
так, што травы лугавыя
ў снег залезуць з галавой.

І няважна ўжо, дарэчы,
у абставінах такіх,
хто мацней у гэты вечар
вые:
сцюжа ці ваўкі?

## ПА ДАРОЗЕ НА БРАСЛАЎ

Мы імчымся ў край азёрны,
край крынічны, баравы.
Мне шанцуе на шафёраў
гаваркіх і баявых.

Едзем.
Думаем.
Гаворым.
І шафёр — мне:
— Знай, стары,
на Браслаўшчыне азёраў,
нібы ў лесе машкары...

А затым з прыжмурам хітрым
і зусім рашыў дабіць:
— А ў азёрах, кажуць, бытта
і русалкі могуць быць...

Змоўк на хвілю.
Нават позірк
ад мяне адвёў няўзнак,
ды й на роўненькай дарозе
што трымаць руль моцна так!

Потым — мірг: ага, спалохаў!
Ды не стала мне блажэць,
бо русалак тых самохаць
не супроць я й сам сустрэць.

Шмат пра іх начуўся змалку,
ды чамусь, як на бяду,
я ніяк сваю русалку
і па сёння не знайду.

◆ ◆ ◆

Не запірае бацька мой вароты,
не зачыняеаначнац аканіцы.
Усё, што ёсць тут, — прынародна,
нікога хата не баіцца.

Замок не трэба ёй на дзверы,
сябрам адчыненыя насцеж.
У дабрыню людскую верыць —
і ў тым
бацькоўскай хаты
шчасце.

## ЖАЛОБНЫ ВЕРШ

*На ўспамін пра Людмілу Несцяровіч*

Закацілася зорачка,
не, не зорачка — зорка,
і на сэрцы так горычна
з успамінам прагорклым,

перапоўненым болем
у жалобе пакутнай.
Мы, на жаль, больш ніколі
не паедзем нікуды.

А збяромся з сябрамі
і на момант прыціхнем,
бо здаецца, што з намі
плачуць зараз і кнігі.





Валянціна Кадзетава

# МЕЛОДЫЯ ЦІХАГА ПАЛЯВАННЯ

*Аповесць*

***Кадзетава-Арэстава Валянціна Мікалаеўна*** нарадзілася 17 красавіка 1951 года ў вёсцы Мікалаеўка Добрушскага раёна. Скончыла Мінскі педагагічны інстытут імя А. М. Горкага. Аўтар шматлікіх публікацый у перыядычным друку і пяці кніг прозы.

Магу пайсці ў заклад, што ні ў адным медыцынскім даведніку вы не знойдзеце назвы гэтай хваробы. А між тым хварэюць на яе тысячы, а можа, і мільёны. Хвароба — хранічная і невылечная — пераважную частку года праходзіць ва ўтоенай форме і таму не трывожыць сваіх носьбітаў. А вось на пачатку лета пачынаецца імклівае яе абвастрэнне. Доўжыцца яно да глыбокай восені, накладаючы своеасаблівы адбітак як на знешні выгляд хворых, так і на іхнія адносіны да службовых і сямейных абавязкаў. Але, як ні дзіўна, ніводзін з тых «тысяч-мільёнаў» зусім не жадае пазбаўляцца сваёй немачы з яе незразумелымі простаму смяротнаму праявамі.

Ну, а цяпер сур'ёзна пра «хваробу», якая (вы ўжо здагадаліся?) зусім і не хвароба, хоць нехта і даў нашай «нехваробе» падобную да медыцынскага тэрміна назву — мікафілія (ад грэчаскага «мікас» — грыб, «філеа» — любоў), а зацятым аматарам блукаць па лесе ў пошуку грыбоў з пачатку лета да замаразкаў — мікафілы. На маю думку, «мікафілы» — гэта не зусім дакладнае азначэнне, бо яго можна аднесці не толькі да «збіральнікаў», але і да «едуноў» — тых, хто занадта ж любіць паласавацца грыбамі, а ў лес і нагі не паказвае. «Збіральнікі», у пераважнай колькасці сваёй, да грыбоў як да ежы ставяцца абыякава, але з задавальненнем частуюць імі знаёмых «едуноў» і радуюцца іхняй амаль дзіцячай радасці: «Ой, грыбочкі!»

Адкуль жа тая апантанасць, з якой чалавек, забыўшыся пра голад і стому, гадзінамі можа хадзіць па лесе і з заміраннем сэрца схіляцца над звычайным баравіком ці рыжыкам? Можа, у неўсвядомленым адчуванні мімалётнага дотыку да таямніцы адных з самых загадкавых стварэнняў прыроды— грыбоў?

Безліч вучоных-міколагаў на працягу доўгага часу імкнецца раскрыць тую таямніцу, але яна дасюль так і застаецца таямніцаю. Некаторыя міколагі ўспрымаюць грыбы свядома-жывымі істотамі, якія адчуваюць людзей і разумеюць іх; другія скептычна ставяцца да такой думкі і сцвярджаюць, што, хоць грыбы маюць агульнага з жывёламі продка і больш блізкія да жывёльнага свету, чым да расліннага, лічыць іх жывымі істотамі памылкова. Грыбы, па іхнім разуменні, — асаблівае царства, узрост якога каля двух мільярдаў гадоў.

Складанасць вывучэння грыбоў у тым, што ніводнаму даследчыку не ўдалося не тое што пакласці на лабараторны стол увесь грыб, але і ўбачыць яго цалкам. Дасведчаныя, вядома, разумеюць, пра што я. Ну, а недасвечаным тлумачу.

Тое, што мы называем грыбам, акуратна зразаем ножыкам ці проста выкручваем рукамі, — гэта толькі малая частка грыба, ягоны плод, па-навуковаму «пладовае цела» (мне ж чамусьці не хочацца называць целам ні пузаценькі баравік, ні яркі падасінавік, ні нават сціплую сыраежку).

Уласна грыб — арганізм няпросты. Знаходзіцца ён пад зямлёю і ўяўляе сабою спляценне доўгіх, падобных да каранёў клетак — сетку міцэлію. У месцы самага шчыльнага перапляцення клетак утвараецца той самы плод, што неўзабаве невядомай сілаю будзе выштурхнуты наверх і трапіць у кошык да ўдачлівага грыбніка. Яшчэ ніхто поўнасцю не змог выкапаць грыб, бо міцэлій вельмі тонкі, далікатны і пры спробе дастаць яго з-зямлі рвецца. Вось чаму грыбы так цяжка вывучаць, і чаму многія высновы даследчыкаў будуюцца на здагадках-меркаваннях, таму бываюць недакладнымі, а іншым разам памылковымі і з часам аспрэчваюцца...

Калі і чаму ўзнікае ў людзей неадольная цяга да ціхага палявання? Неяк пачула, што варта толькі чалавеку праглынуць хоць драбніцу грыбных спор, як ён тут жа стане заядлым грыбніком.

Вядома, гэта толькі жарт, так што нават пры вялікім жаданні далучыцца да кагорты мікафілаў глытаць споры грыбоў не трэба. Хоць і не шкодна тое, але бескарысна.

Многія псіхолагі лічаць, што схільнасць да такога роду дзейнасці, як рыбалоўства, уласна паляванне і паляванне ціхае закладзена прыродаю ў кожным з нас і што далейшае развіццё гэтых схільнасцей залежыць ад жыццёвых абставін. Хачу на канрэтным прыкладзе паказаць, што гэта не зусім так.

Абодвух сваіх сыноў, пачынаючы з пяцігадовага іхняга ўзросту, я вадзіла ў лес, расказвала ім пра дрэвы, лекавыя расліны, вучыла шукаць грыбы і разбірацца ў іх. Ад вёскі, дзе жылі мае бацькі і куды я з дзецьмі прыязджала на ўсё лета, да «галоўнага» лесу кіламетры тры, і маці неаднойчы дакарала мяне за тое, што «зноў цягну дзіцятка ў такую даль». Я моўчкі ўсміхалася: маці забылася, відаць, як нас з братам, зусім малых яшчэ, «цягала» ў тую ж «даль».

Спачатку я вадзіла ў грыбы старэйшага сына, потым малодшага і чаго толькі не выдумляла, каб прывабіць сваіх хлопцаў да найцікавейшага і найкарыснейшага, на маю думку, занятку — пошуку грыбоў! Імітавала голас лесавіка, які вітаў сваіх гасцей і абяцаў шчодра падзяліцца лясным багаццем; прыкладала ўсе намаганні, каб прыкмечаны мною грыб-прыгажун быў «знойдзены» маім сынам, а калі заўважала, што юны грыбнік пачынаў стамляцца, забягала наперад і чапляла на кусты ці маладыя дрэўцы цукеркі ў яркіх каляровых абгортках, каб потым разам з сынам здзіўляцца вялікаму цуду. І ведаеце, хоць з таго часу прайшоў не адзін дзясятак гадоў, мой старэйшы сын дасюль памятае

і голас лесавіка, і «цукеркавае дрэва» і гаворыць, што доўга верыў у тое дзіва. Ён, сёння ўжо сталы мужчына, такі, як і я, мікафіл. А вось малодшы… Калі пра лес, то толькі пра шашлыкі, калі пра грыбы, то толькі пра тыя, што на патэльні ці ў слоіках. Вось табе і маеш! А ў аднолькавых жа абставінахраслі! Не ўжо, таго, што не дадзена прыродаю, нельга ні прышчапіць, ні развіць. Генетыка. З ёю не паспрачаешся. Старэйшы ў мяне ўдаўся, малодшы — у мужа. Той, калі пасля маіх доўгіх упрошванняў і рабіў ласку пайсці са мною ў лес, то адразу клаўся там на паляну і ляжаў сабе ўвесь час, пакуль я збірала грыбы. Гаварыў, што ў лесе яму нецікава.

Ад усёй «грыбной адысеі» майго мадодшага сына засталася толькі некалі складзеная ім казка пра падземнае грыбное каралеўства з гарадамі, вуліцамі і дамамі, адкуль бацькі-грыбы выштурхоўваюць на паверхню непаслухмяных дзетак-грыбочкаў.

Скажыце, вам нічога не нагадвае гэтая гісторыя, прыдуманая сямігадовым хлопчыкам у далёкія цяпер васьмідзясятыя? Мне яна часта ўспамінаецца. Успомнілася і сёння, калі зусім выпадкова прачытала выказванне англійскага пісьменніка, філосафа і мастацтвазнаўцы Джона Раскіна: «Дзяцінства часта трымае ў сваіх слабых пальцах ісціну, якую не могуць утрымаць дарослыя людзі сваімі мужнымі рукамі і адкрыццё якой складае гонар пазнейшых гадоў».

Мікалогія, як і ўсякая іншая навука, не стаіць на месцы. Але нават тады, калі міколагі змогуць дасягнуць найвялікшых поспехаў у раскрыцці адвечнай таямніцы грыбоў, гэта ніколечкі не паўплывае на душэўны стан чалавека, назаўжды закаханага ў вялікі прыродны цуд — лес.

Пачуццё, што агортвае мяне ў хвіліны кожнага першага ў сезоне паходу ў лес, амаль неазначальнае. Захапленне прыгажосцю паляны, засланай зялёным абрусам мяккага моху, замілаванасць адзінокім маладзенькім дубочкам, якому чамусьці захацелася пасяліцца сярод соснаў, асалода ад водару хвоі — усё гэта потым. А спачатку ўзнёслая і разам з тым ціхая, нават нейкая пяшчотна-казытлівая радасць ад судакранання з вечнасцю і надзея на ўласнае доўгае-доўгае, а можа, і бясконцае існаванне. А яшчэ чаканне цуду.

У чаканні гэтага цуду я пачынаю хадзіць у лес ужо ў красавіку: а раптам выглянене з-пад мінулагодняга лісця які-небудзь дзівакаваты баравічок ці хаця б падбярозавік? Але не, адно страчкі ды смаркчі, зморшчаныя, бы твары стагадовых старых. У мяне да гэтых грыбоў устойлівая непрыязнасць і, хоць неаднойчы чула ад «едуноў», што смажаныя смаркчі — смаката, а смаркчі сушаныя ўвогуле далікатэс, ніколі не стану збіраць гэтыя грыбы. Яны нават выглядам сваім выклікаюць у мяне непрыемныя асацыяцыі.

Так і не знайшоўшы ніводнага дзівакаватага грыбочка, я не сыходжу з лесу, а кіруюся да паляны, парослай бруснічнікам. Каб чай з сушанага бруснічніку атрымаўся пахкім і карысным, трэба збіраць лісце, пакуль на расліне яшчэ не з'явіліся бутончыкі. Збіраю, вяртаюся дадому і з нецярплівасцю чакаю першай хвалі адных з самых улюбёных маіх грыбоў — маслякоў. Прыносіць тую хвалю цёплая і дажджлівая сярэдзіна чэрвеня і, здараецца, нават самы яго пачатак.

Маслякі раннія (зярністыя) селяцца сем'ямі ў невысокай траве ўздоўж дарог, на палянах і пад соснамі ў рэдкім хвойніку. Праўда, іхнюю мякаць вельмі ўпадабалі лічынкі мух і грыбных камарыкаў, таму жыццё зярністых маслякоў недаўгавечнае: нейкіх чатыры-пяць дзён, і быццам бы і не было заманлівых сваёй свежасцю і сціплым бляскам светла-карычневых шапачак. Замест іх —

друзлыя «лапці». Некаторыя грыбнікі выбіраюць сярод «лапцяў» найменей пашкоджаныя лічынкамі і кладуць грыбы ў кошыкі, каб дома пры дапамозе розных хітрыкаў павыганяць нахабных чарвякоў вонкі. А такіх хітрыкаў сёння ў інтэрнэце хоць гаць гаці.

«Каб пазбавіцца ад чарвякоў у грыбах, трэба разрэзаць іх, пакласці ў падсоленую ваду на некалькі гадзін. Адчуўшы соль, чарвякі вылезуць.Такім чынам усе лічынкі пакінуць плады. Цяпер трэба перамыць грыбы і прыступіць да прыгатавання».

Так, чарвякоў можна павыганяць з упадабанага імі ўтульнага месцейка ў салодкай грыбной мякаці. Толькі ж «кватаранты» тут не толькі жывуць і харчуюцца, але і — як бы гэта далікатней сказаць? — выпрацоўваюць прадукты сваёй жыццядзейнасці. А прадукты тыя з прычыны сваёй немабільнасці ну ніяк не могуць прыпадабніцца да чарвякоў і ўслед за імі сысці. Вымыць жа ці вычысціць іх немагчыма. І ніякая тэрмічная апрацоўка не дапаможа знішчыць чарвячыную спадчыну. А небяспечныя таксіны могуць не толькі справакаваць нястраўнасць, але і стаць атрутай для ўсяго арганізма. Так, прынамсі, лічыць большая частка спецыялістаў. Ды і калі нават пагадзіцца з думкай тых, хто гаворыць пра бясшкоднасць ужывання грыбоў з эскр… прадуктамі жыццядзейнасці чарвякоў, што рабіць з элементарным пачуццём гідлівасці?

Але наш інтэрнэцкі дарадчык, відаць, лічыць усё гэта неістотным і таму прапаноўвае яшчэ адзін спосаб пазбаўлення ад паразітаў з меркаванай затым падрыхтоўкай грыбной стравы.

«Трэба разрэзаць грыбы, выкласці на металічнае сіта і адправіць у духоўку. Тэмпература павінна быць самая малая. Пасля грыбы трэба пачысціць ад чарвякоў, якія ў час сушкі вылазяць напалову».

Як я разумею, трэба браць кожнага чарвяка за высунутую ягоную палавіну і выцягваць. Здзіўляюся, як гэта аўтар не пажадаў вам «смачна есці!». У вас жа пасля такіх маніпуляцый апетыт, відаць, будзе хвацкі!

Дарэчы, у канцы сваіх разважанняў той жа аўтар ўсё ж перасцерагае:

«У вельмі старых і друзлых грыбах не застаецца нічога карыснага, таму іх не трэба апрацоўваць і есці».

Бач ты, есці не трэба… А так хацелася!

Дасюль памятаю, як у нашай вёсцы пасмейваліся з аднаго дачніка, збіральніка недаедзеных чарвякамі баравікоў: «Ну што, Віктар, мяса многа назапасіў?» Але Віктар наш ніколечкі не бянтэжыўся: «Грибы едят — в потолок глядят».

Не ўжо, ніколі і нізавошта я не вазьму ніводнага грыба, хоць колькі пашкоджанага паразітамі! І вам не раю, бо думаю, што нікому з вас не захочацца есці лясныя гасцінцы з такімі неапетытнымі напаўняльнікамі. З той жа прычыны не раю купляць у выпадковых людзей сушаныя грыбы, таму што людзі нядобрасумленныя (а іх у «грыбным бізнесе» хапае) праводзяць два віды сушак: для сябе і на продаж з усімі наступствамі. І ў сушцы «на продаж» «прадуктаў жыццядзейнасці чарвякоў» можа быць столькі, што ўжыванне такіх грыбоў можа стаць небяспечным для здароўя.

Але вернемся да нашых маслякоў. Другая іх хваля выпадае на сярэдзіну ліпеня пры дастатковай вільготнасці глебы. Спякотны ліпень не парадуе вас гэтымі грыбамі. Але нічога: самыя ядраныя, чыстыя маслякі (познія) літаральна запаланяюць маладыя сасоннікі ў канцы жніўня і на пачатку верасня. Запаланяюць лес і грыбнікі, але ўсе вяртаюцца з поўнымі кошыкамі, мяркуючы

насмажыць, намарынаваць і насушыць гэтых вельмі смачных грыбоў. Праўда, перш за ўсё іх трэба належным чынам падрыхтаваць для перапрацоўкі. Шапачкі ўсіх маслякоў пакрытыя тонкай ліпкай скуркаю, а ў восеньскіх, у адрозненне ад ранніх зярністых, пад шапачкаю ёсць яшчэ і белая плёнка. І скурку, і плёнку неабходна зняць. З кожнага, нават самага маленькага грыбочка. Занятак гэты вельмі працаёмкі і патрабуе стараннасці і ўседлівасці, таму, перш чым набіраць «цэлы воз» маслякоў, трэба добра падумаць.

Дасюль усміхаюся, калі ўспамінаю адзін выпадак.

Недзе напрыканцы жніўня прыбегла да мяне суседка па дачы Іна (дачамі мы называлі вясковыя хаты, што дасталіся нам у спадчыну ад нашых бацькоў і дзе мы звычайна летавалі). Задыханая Іна ўрачыста паведаміла, што на Залескай Гары «мора маслякоў» і што нам трэба спяшацца, пакуль не панаязджалі туды нашы адвечныя канкурэнты — гамяльчане.

Не ўбачыўшы на маім твары водбліску сваёй радасці, Іна здзівілася:

— Што здарылася? Дрэнна пачуваешся?

— Горш чым дрэнна: адпачынак праз два дні заканчваецца

— Было бяды! Мы яго на некалькі дзянькоў прадоўжым, — заявіла Іна. — На такі выпадак у мяне знаёмства ў раённай паліклініцы ёсць.

— Ты што! У нас жа педсавет!

— А што хвораму чалавеку на тым педсавеце рабіць, акрамя як інфекцыю разносіць? — па-змоўніцку падміргнула Іна.

Як ні сорамна цяпер прызнавацца, але ўгаварыла яна мяне.

Яшчэ не развіднела, а мы — Іна са сваім мужам Юрам і я — ужо былі ў хвойніку. У руках кожнага з нас па два кошыкі.

Грыбоў сапраўды было «мора»! Ды якіх грыбоў! Маладых, пахкіх, чысценькіх, што тое шкло, на пругкіх тоўсценькіх ножках! І мы прагна кінуліся збіраць іх і класці ў кошыкі, не зважаючы на прыліплыя да шапачак сасновыя іголкі і шматочкі моху.

У неадольным жаданні назбіраць грыбоў як мага больш мы не разгіналі спіны, а часам увогуле поўзалі пад соснамі, літаральна выграбаючы з-пад іх цэлыя сем'і маслякоў. Мы не бачылі прыгажосці ранішняга лесу, не чулі птушыных галасоў, адно прыслухоўваліся, ці не з'явіліся ўжо паблізу такія ж, як мы, ахвотнікі да ляснога багацця. І ніхто з нас у гэтыя моманты не заўважаў, што ў сваёй апантанасці мы станавіліся больш падобнымі да «братоў сваіх меншых», чым да найвышэйшых стварэнняў прыроды.

Калі грыбы ўжо пачалі выпадаць з перапоўненых кошыкаў, Іна дастала з кішэні пакет, які абачліва ўзяла з сабою, але, сустрэўшы незадаволены мужаў позірк, паклала пакет назад.

Да таго часу, як у лесе пачуліся крыкі і галёканне «мамаевай арды» гамяльчан, мы з пераможнымі ўсмешкамі на тварах ужо выходзілі на дарогу і дамаўляліся гэтак жа рана прыйсці сюды і заўтра. Толькі ўжо праз некалькі хвілін мы ўсвядомілі цану нашай сквапнасці. Перапоўненыя кошыкі (па два ў кожнага з нас) несці было не толькі цяжка, але і няёмка: грыбы падалі з кошыкаў, рукі нямелі. Але ў поўнай меры мы зразумелі тую цану ўжо дома.

Я высыпала грыбы на разасланую ў верандзе цырату, прысела перад імі на нізенькі ўслончык і тут адчула, што эйфарыя, выкліканая ўдалым грыбным паходам, паціху сплывае, саступаючы месца заклапочанасці. Трэба было набірацца цярпення і грыбок за грыбком выслабаняць ад ліпкай скуркі і белай

плёначкі. Недзе гадзіны праз паўтары карпатлівай і аднастайнай працы я пачала незадаволена пазіраць на ўсё яшчэ салідную кучу нячышчаных грыбоў. А праз нейкі час увогуле злавіла сябе на «крамольнай» думцы: «А можа, ну іх?..»

І тут прыйшло збавенне ў асобе маёй родзічкі цёткі Лёксы, якой было ўжо добра за семдзесят:

— Вой, якія ладненькія грыбочкі! А якая з іх смачная поліўка! — усклікнула яна і тут жа сумна ўздыхнула: — А мяне ногі мае да лесу ўжо не данясуць...

Я з палёгкаю ўздыхнула, зграбла з цыраты ўсе неапрацаваныя грыбы і ссыпала іх у цэлафанавы пакет:

— Бярыце, цётачка! Толькі, калі ласка, самі пачысціце.

— А няўжэ ж, сама пачышчу! А няўжэ ж! Вось жа дзякуй табе вялікі! Няхай Бог табе здароўечка дае, дзетачка!

Узрадаваная цётка Лёкса патэпала дадому, а з «дзетачкі» перадпенсійнага ўзросту быццам сто пудоў звалілася.

Я перамыла грыбы і ўжо наважылася адварыць іх і засаліць, але ўбачыла, што солі ў мяне малавата, і вырашыла пазычыць яе ў Іны.

Іна сядзела пасярод двара перад даволі вялікай кучаю маслякоў і... плакала, выціраючы слёзы тыльным бокам далоні.

— Ты чаго адна тут петуешся? — спыталася я. — А Юра дзе?

— Ды ўцёк гультай гэты. Спачатку дапамагаў мне, а потым сказаў, што не памятае, ці замкнуў гараж, і памчаўся на дызель. Брахун такі. А мне вось над гэтымі грыбамі да позняй ночы сядзець трэба. А ты, — Іна з надзеяй зірнула на мяне, — са сваімі ўжо разабралася?

«Ну вось, трэба ж мне было перціся па тую соль да Іны! — запознена раскаялася я. — Паленавалася ў магазін схадзіць».

Але што было рабіць? Не пакідаць жа суседку, амаль сяброўку, у такой сітуацыі!

«Петавацца» мы з Інаю скончылі прыцемкам і як не ў адно слова пакляліся, што «ні ў якія маслякі не тое што заўтра, а ўвогуле ніколі не пойдзем».

І праўда, назаўтра на Залескую Гару мы не пайшлі. Пайшлі паслязаўтра.

У нашы дні можна пачуць ад знаёмых ці прачытаць ва ўсюдыісным інтэрнэце мноства так званых лайфхакаў пра тое, як «проста і лёгка» пачысціць маслякі. Як грыбнік (грыбніца?) з салідным стажам хачу сказаць: няма ў нашым выпадку «лёгкіх і простых» спосабаў, якія можна было б лічыць надзейнымі. Адзіна надзейным быў і ёсць спосаб «дзедаўскі». Толькі трэба, каб ножык, якім вы збіраецеся чысціць маслякі, быў невялічкім, даволі вострым і з тонкай дзюбачкаю. Такі вось лайфхак ад мяне.

Яшчэ адно «маслячынае пытанне», што актыўна абмяркоўваецца між грыбнікамі: а ці можна ўвогуле не ачышчаць маслякі ад скуркі?

Некалі адна наша вясковая кабета Ёўга сушыла, смажыла і саліла маслякі разам са скуркаю і таму мела на зіму такі багаты запас гэтых грыбоў, якога не мела ніводная, нават самая руплівая гаспадыня. Ёўга была жанчынай адзінокаю, таму ахвотна раздавала сушаныя і салёныя маслякі на гасцінец усім сваім родзічам і знаёмым. Родзічы і знаёмыя ад гасцінца не адмаўляліся, але грыбы Ёўзінага прыгатавання елі не ўсе, бо есці іх можна было толькі пры наступных умовах:

а) калі вам даспадобы «кісельны» суп ці боршч з сушанымі маслякамі;

б) калі ваш эстэтычны густ не пакутуе пры выглядзе жэлепадобнага расолу маслякоў салёных;

в) калі вас не засмучае прысмак гаркаты ў грыбах смажаных і тушаных;

г) калі ваш страўнік не рэагуе на паслабляльнае ўздзеянне скуркі маслякоў.

Зрэшты, гэта пытанне выбару і густу. Ва ўсялякім разе, не чула, каб калі хоць хто-небудзь атруціўся маслякамі з той прычыны, што яны былі прыгатаваныя разам са скуркаю. Ну а я прытрымліваюся маіх сямейных традыцый і традыцый жыхароў маёй малой радзімы — вёскі Мікалаеўка, што ў Добрушскім раёне: ніколі не бяру маслякоў (і не толькі маслякоў), хоць колькі пашкоджаных паразітамі; старанна ачышчаю кожны грыб ад скуркі; буйнейшыя сушу, а драбнейшыя, папярэдне два разы хвілін па пятнаццаць адварыўшы, салю, марыную, замарожваю ці кансервую. І атрымліваюцца ў мяне вельмі апетытныя з выгляду маслячкі, асабліва маладзенькія, у слоіках. Дарэчы, ні смакам сваім, ні карыснасцю масляк ніколечкі не саступаюць баравікам.

На жаль, і ў мінулым годзе, і сёлета праз спякотнае лета грыбоў было мала, і ўвогуле не было маслякоў. Але вось у другой палове лістапада яны падрыхтавалі грыбнікам сюрпрыз: масава «стрэлілі» на травяністых палянах у рэдкім сасонніку. І былі гэта маслякі зярністыя, тыя, што звычайна растуць у чэрвені і якасцямі сваімі не могуць сапернічаць з першагатунковымі познімі верасеньскімі, таму я, перш як пачаць збіраць маслякі «другагатунковыя», зазірнула ў малады сасоннік, што знаходзіўся зусім побач і дзе звычайна раслі маслякі «першагатунковыя», познія. Дык вось, у тым лясочку, на маё здзіўленне, было абсалютна пуста. Хоць бы адзін грыб! Хоць бы паганка якая! А тут такі цуд!

Грыбы ў траве і пад немаладымі соснамі раслі не проста сем'ямі, а своеасаблівымі букетамі, у кожным з якіх ціснуліся адзін да аднаго дзясятак, а іншым разам і больш светла-карычневых пахкіх прыгажуноў. Былі тут і маладыя маслячкі, і з шапачкамі памерам з далонь, і неверагодных для маслякоў памераў веліканы. І ніводнай чарвяточыны, і ніякай друзласці, уласцівай ранням зярністым маслякам! Нават веліканы былі такімі ж свежымі і пругкімі, як і маладыя грыбочкі. Хаця чаму тут здзіўляцца? Гэта ж быў, лічы, парог зімы, і ўсе зламысныя мухі і грыбныя камарыкі паснулі ўжо вечным сном. Здзіўляцца трэба было такому масаваму росту маслякоў летніх у познюю восеньскую пару. Не, зрэдку здаралася, што ў цёплае не па сезоне надвор'е грыбы з'яўляліся ў лесе нават у снежні. Але каб у такой колькасці і такімі «букетам»?!

На гэтае багацце я натрапіла выпадкова: прыехала на сваім звычайным транспарце — веласіпедзе — па шыпшыну, якую збіраю звычайна пасля прымаразкаў, і па даўняй звычцы наведала гэты лясок. У мяне з сабою мелася толькі вядро літраў на восем. Як вы, мабыць, зразумелі, у хуткім часе яно было «з верхам». Трэба было вяртацца дадому за больш ёмістай тараю. Я яшчэ нейкі час пахадзіла па лесе, папрыслухоўвалася, паўзіралася. Нідзе нікога. Значыць, сёння неабавязкова вяртацца сюды. Прыеду заўтра. Усё адно ніхто не здагадваецца, што ў такую пару ў лесе можна знайсці нешта вартае. Вось ужо назапашу я маслячкоў! Меншанькія замарыную, а «веліканы» засушу. Некаторыя лічаць, што маслякі непрыдатныя для сушкі. Відаць, яны не ведаюць, як здорава пахнуць маслякі сушаныя! І які смачны боршч ці суп з гэтымі грыбамі! Толькі варта памятаць, што сушыць іх трэба ў духоўцы пры зусім малой тэмпературы і невялікімі порцыямі, прынамсі, не класці іх на рашотку ў некалькі пластоў, інакш яны перад тым, як высахнуць, спякуцца і ў сушаным выглядзе будуць чорнымі. Ну і булён з іх таксама будзе мець цёмны, неапетытны выгляд.

ПАЭЗІЯ

# Васіль Казачок

## ТРЫЯЛЕТЫ



***Казачок Васіль Андрэевіч*** нарадзіўся 30 ліпеня 1956 года ў вёсцы Гарадная Столінскага раёна. Пасля заканчэння Гараднянскай СШ (1973) служыў у войску. Вучыўся ў Брэсцкім педінстытуце (1977—1982) на філфаку (аддзяленне беларускай мовы і літаратуры). Працаваў у Гараднянскай сярэдняй школе настаўнікам роднай мовы і літаратуры. З 2018 г. — загадчык Цэнтра ганчарства ў вёсцы Гарадная. Аўтар паэтычнага зборніка «Прызнанне» (2018).

◆ ◆ ◆

Зноў коціць восень агнявое кола —
Зырчэюць дрэў халодныя кастры.
Назад, у лета, спалены масты.
Зноў коціць восень агнявое кола.
Яе агнём кранутыя лісты
Імкнуць з пакорнасцю ў абдымкі долу.
Зноў коціць восень агнявое кола —
Зырчэюць дрэў халодныя кастры.

◆ ◆ ◆

Чым больш жыву, тым болей прагну жыць:
Тварыць і адкрываць сусвет бясконцы,
Здзіўляцца снегу, ранішняму сонцу.
Чым больш жыву, тым болей прагну жыць.
І хоць сляза самоты набяжыць,
Жыццёвы келіх буду піць да донца.
Чым больш жыву, тым болей прагну жыць:
Тварыць і адкрываць сусвет бясконцы.

◆ ◆ ◆

Жыццё людское не салодкі сон —
Нялёгкая цярністая дарога

У багну д’ябла або ў храм да Бога.
Жыццё людское не салодкі сон.
Нам неба — як духоўны парасон,
Надзейны шчыт ад бедаў і трывогаў.
Жыццё людское не салодкі сон —
Нялёгкая цярністая дарога.

◆ ◆ ◆

Самотай скрушнаю, зіма,
Не тчы свайго нявер’я кросны:
Свет не адолееш дзівосны
Самотай скрушнаю, зіма!
Як ні стараешся — дарма:
Адчаю лёд растопяць вёсны.
Самотай скрушнаю, зіма,
Не тчы свайго нявер’я кросны.

◆ ◆ ◆

Над вёскай кружыць, кружыць белы снег.
Дрыготкім сном спавіта наваколле,
І вабіць цнотай белае раздолле.
Над вёскай кружыць, кружыць белы снег.
І вольным думам лёгка на прыволлі.
І час, здаецца, прыпыніў свой бег…
Над вёскай кружыць, кружыць белы снег.
Дрыготкім сном спавіта наваколле.

◆ ◆ ◆

А восень сцеле, сцеле дываны…
У вальсе развітальным лісце кружыць,
Цалуюць клёны твар халодных лужын.
А восень сцеле, сцеле дываны…
І скрушна без птушынай гаманы.
Пустыя гнёзды — у самоце тужаць.
А восень сцеле, сцеле дываны…
У вальсе развітальным лісце кружыць.

◆ ◆ ◆

Рассыпаў верасень грыбы.
Грыбамі шчодрыць лес асенні —
І вольна марам-летуценням.
Рассыпаў верасень грыбы.
Тугі, самоты і журбы
Кудысьці адплываюць цені.
Рассыпаў верасень грыбы.
Грыбамі шчодрыць лес асенні.

ДРАМАТУРГІЯ

# Алег Ждан-Пушкін

# СТАРАЯ, ЯКАЯ СМЯЕЦЦА, АБО ДА ЗІМЫ ДАЛЁКА

*Аднаактовая п'еса*



***Ждан-Пушкін Алег Аляксеевіч*** нарадзіўся 5 студзеня 1938 года ў Смаленску. Жыў і вучыўся ў Мсціславе. Скончыў гісторыка-геаграфічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута і Літінстытут імя Максіма Горкага ў Маскве. Аўтар многіх кніг прозы. Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Рэспублікі Беларусь.

## ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ:

Баба Каця, Баба Тоня, Баба Зена — жанчыны пенсійнага ўзросту.
Трэцяя пакупніца — жанчына 50 гадоў.
Ліда-Лідуся — жанчына 35 гадоў.
Загадкавая — жанчына 30 гадоў.
Дзяцюк — мужчына гадоў пад 40.
Леначка — дзяўчынка прыкладна сямі-васьмі гадоў.
Вядоўца — ад аўтара.
Каза Маня і казёл Ваня.

Тэкст Вядоўца і Бабы Каці даволі вялікі, таму прапаную кожную з гэтых роляў выконваць двум акторам. У гісторыі тэатра такія драматургічныя рашэнні, як вядома, ёсць. Але ж я не супраць, калі добрая актрыса ўвесь тэкст возьме на сябе.

*Дзея адбываецца ў Мінску ці ў любым вялікім горадзе Беларусі, напрыканцы стагоддзя мінулага ці на пачатку цяперашняга.*

Вядоўца. Вуліца была шырокая, машыны несліся як звар'яцелыя, але ж іншым разам, калі Ваня быў у настроі, пераадольвалі яе за адзін сігнал святлафора. Ну а не — спыняліся пасярод, на астраўку бяспекі. *(Чуваць гул машын, міліцэйскіх сігналаў.)* Зразумела, кіроўцы, убачыўшы Яе з казой і казлом, смяяліся, нешта крычалі, сігналілі, Ёй таксама было трохі смешна, Яна і сама пасмяялася б з імі за кампанію, толькі ж Ваня мог у любы момант скокнуць

убок, і што тады? Моцна трымала яго за вяроўку правай рукой, Маню левай. А за спінай вісеў мяшочак з пажыткамі — усё самае каштоўнае, што мелася ў Яе і было заўсёды пры Ёй.

Баба Каця. Два разы на дзень мы пераадольваем гэтую вуліцу туды і сюды: раніцай, калі выпраўляемся да нашых пастаянных кліентаў, і ўвечары. Вядома, можна было б падаіць Маню на месцы, прывязаць з Ванем ля возера і занесці малако. Але ж рэч у тым, што кліенткі нашы — людзі няпростыя, хочуць, каб даіла Маню ў іх уласны посуд, на іх уласныя вочы. Малачко п'юць толькі свежае, сырадойнае, а таму бяруць патроху — па паўлітра, часам літр. Маня каза добрая, малочная, да чатырох літраў дае летам за дзень, а разлічваюцца гаспадынькі няблага, і за гэтыя грошы я магу купіць сабе і батон, і крупы, і масла, і нават мяккай каўбаскі. *(Чуваць голас міліцэйскага мікрафона: «Грамадзянін у капелюшы, спыніцеся на астраўку бяспекі!.. Аўтамабіль 43-84, вызваліце праваю паласу!..» і г. д.)*

Яшчэ можна было б Ваню пакінуць аднаго каля дома, і аднойчы паспрабавала — ледзь не засіліўся на вяроўцы, якой прывязала яго да ліпкі, — гэтакірваўся ўслед, гэтак любіў Маню і баяўся застацца адзін. Было за што любіць: ласкавая Маня, пяшчотная, паслухмяная. Ды і прыгажуня.

Маня таксама яго кахала. Прынамсі, падчас даення заўсёда пазірае на яго, маўляў, вось я якая малочная, якое вымя ў мяне далікатнае, ружовае, якія саскі... Зноў жа, сакавітую галінку заўсёды абгрызе толькі з аднаго боку, — паеш і ты, Ваня.

Вядоўца. На гэтыя малочныя грошы і жыла баба Каця, а пенсію сваю маленькую — такую маленькую, што ў ашчадным банку заўсёды па два разы глядзелі ў камп'ютар, што ў той бінокль: ці праўда? — Яна апошнім годам увогуле не брала, хай ашчаджаюцца, можа, назбіраецца столькі, што... Ды ўжо ж прыдумае, як з імі абысціся, што зрабіць. Грошыкі — гэта ўсё. Няма нічога мілейшага за іх. Вось толькі запазнілася Яна з такім разуменнем. А як жа, усё жыццё любіла іх, як усе людзі, аднак не так, як цяпер. Ого, грошыкі!.. Людзі здольныя дзеля іх на ўсё. Гэта Яна добра адчула на сваёй старой шкурцы.

Ідзе Маня ахвотна, нясе вымя годна, далікатна пастуквае маленькімі абцасікамі. Наліліся саскі за ноч, капае малако на асфальт. Ведае Маня, што хутка, там, каля прыгожых высокіх дамоў, будзе ёй палёгка. Ды і гасцінцы будуць — хто прынясе хлебца, а хто і цукерку. Ну а Ваня то адстае, то забягае наперад, ірвецца да кожнага сметніка, высока задзірае крутарогую галаву, трасе бародкай, — думае, што Маня любуецца яго мужчынскаю прыгажосцю.

Баба Каця спыняецца сярод высотных дамоў. Тут яе ўжо чакаюць пакупнікі: жанчыны рознага ўзросту і дзяўчынка Леначка. Частуюць, лашчаць жывёлін.

Леначка. Бабуля, Ваню я дала батона, а Мані цукерку.

Баба Каця. Добра, добра. Маня любіць салодкае. А Ваня мужчына, яму лепш батон. Ён нават недакуркі падымае.

Леначка. Баба Каця, а Маня і Ваня — сям'я?

Баба Каця. Так, сям'я.

Леначка. І козачкі ў іх будуць?

Баба Каця. А як жа, будуць.

Леначка (*умольна звяртаецца да сваёй бабулі, бабы Тоні*). Бабуля, хачу козачку!

Баба Тоня. Дзе ж яна будзе жыць у нас, унучачка?

Баба Каця. Мінулым летам прынесла Маня дзвюх козак. Што з імі рабіць? У суп — рука не падымаецца. Панесла на рынак, у Ждановічы. Людзі міма ідуць — спыняюцца, усміхаюцца, дзеткі па галоўках пагладжваюць, а вось купіць — не, не хочуць... Ледзь прадала нейкай старой з вёскі. Амаль задарма, абы пазбавіцца.

Маўчанне.

Леначка (*да бабы Каці*). Баба Каця, дазвольце мне трошкі падаіць Маню?!

Баба Каця. Ну, а чаго ж не? Падаі, як падабаецца. *(Дастае з мяшка складны зэдлік. Леначка ўладкоўваецца ля казы).*

Баба Тоня. Бяда, ох, бяда! Бацька ўжо колькі гадоў сена сабакам косіць, а маці паехала ў Маскву на заробкі, ды і знікла. Унучачка спадзяецца, што вернецца, знойдзецца мама. А як яна знойдзецца, калі год праміnуў — ні слыху ні дыху. І што мне рабіць? Колькі я яшчэ пражыву? І што ёй рабіць, як памру?

Вядоўца. Вядома, гора-горкае, і пра гора баба Каця ўсё ведае і на смак, і на выгляд... Хацела аднойчы зменшыць для іх цану за малако, але ж — грошыкі. Трэба грошыкі.

Баба Тоня. Глядзіце, Загадкавую на машыне прывезлі!.. Не люблю яе. Нашы імёны не спытала, сваё не назвала. Маладая, а ўжо капрызлівая, усё ёй не так. Глядзіць, быццам глынула палыннага ўзвару.

Баба Каця. Хто ж ведае, якое ў яе жыццё.

Баба Тоня. Думаю, неблагое. Дарэчы, гаспадар яе — таксама загадкавы чалавек. Бачыла раз, як яго везлі на машыне. Уй-юй! Можа, бандыт, а можа, важны начальнік. Гадоў на трыццаць старэйшы за яе. Такая цяпер мода. Я б таксама пайшла за якога, гадоў на трыццаць маладзейшага.

Баба Каця. Не палохай мяне.

Падыходзіць Загадкавая, спыняецца ўбаку, няўцямна вітаецца.

Леначка (*падымаецца з зэдліка*). Глядзі, бабуля, колькі я надаіла.

Баба Тоня. Малайчынка, ох, малайчынка! Якраз на аднаго чалавека.

Баба Каця. Вось цёця на машыне прыехала. Яна спяшаецца.

Загадкавая. Я гэта малако браць не буду. Нельга даручаць дзіцяці такую працу. Вымя трэба праціраць сурвэткамі.

Баба Тоня. Я вазьму гэта малако. Мне далікатныя дзіцячыя пальчыкі — адна радасць.

Загадкавая. Я не пра пальчыкі. Я пра малако.

Баба Каця. Не хвалюйцеся, калі ласка. Пачакайце тры хвіліны.

Баба Тоня (*насмешліва*). Сурвэткі прынесла?

Загадкавая. Прынесла. Патрабаванні звычайнай гігіены.

Баба Тоня (*здзекліва*). Гі-гі-е-ны! А вось я без сурвэтак усё жыццё.

Загадкавая. Тут хваліцца няма чым. Я з маладосці прывыкла да чысціні.

Баба Тоня. Зразумела, вы ж не такія, як мы. Вы лепшыя. Чыстыя і бліскучыя. Дарэчы, бачыла, як ваш муж уранку ў машыну садзіўся. Шафёр яму дзверы адчыняў і кланяўся амаль у ногі. Цьфу! Можа, і парасон трымае, калі дождж?

Загадкавая. Вы нічога не ведаеце пра майго мужа. Ён амаль усё жыццё шмат працаваў.

Баба Тоня. А я ўсё жыццё ў калгасе гуляла. Кароў рукамі даіла. Вось і баляць мае ручкі, днём і ноччу баляць...

Загадкавая. Я вам спачуваю. Відаць, у кожнага пакалення свае болькі.

Баба Тоня. Вашы болькі — шчыкотка ў параўнанні з простымі людзьмі.

Загадкавая. У кожнага свае параўнанні. Але ж за што вы нас ганьбіце?

Баба Тоня. За тое, што мяне ганьбілі ўсё жыццё.

Загадкавая. Не там вы шукаеце вінаватых.

Баба Тоня. Ясна. Вінаватых не было і няма.

Баба Каця. Тоня, памаўчы, а то малако скісне. Каза вунь хвалявацца пачынае. *(Да казы.)* Не хвалюйся, Маня, зірні на Ваню, ён спакойны. Гэта жанчыны зранку трохі не ў настроі...

Загадкавая (*забірае слоік з малаком, разлічваецца. Адыходзіць, але праз колькі крокаў прыпыняецца. Да бабы Тоні*). Дарэмна вы. У мяне таксама ёсць пытанні да жыцця... Калі б не мой сённяшні чалавек, невядома, ці бачылі б вы мяне, а я вас.

Агульнае маўчанне. Загадкавая сыходзіць.

Баба Тоня. І чаго жанчыне не хапае? Калі муж буйны начальнік — жыві і весяліся, калі бандыт — нікога не бойся. А ўсё ж шкада яе...

З'яўляецца баба Зена, таксама шаноўнага веку.

Баба Зена. Здарова, бабанькі! Як вы сёння? Што баліць, што не баліць?

Баба Тоня. Усё баліць.

Баба Зена. Ну, ты яшчэ маладая, рана скардзіцца.

Баба Тоня. А я не скарджуся, я хвалюся: баліць, а я жыву. Прачнуся ноччу — ціха, цёмна... На якім гэта я свеце? А тут нага як таргане! Го-о! На гэтым!

Баба Зена. Малайчына. А як твае ўнукі?

Баба Тоня. Не пахвалішся. Учора праверыла кішэні ў Лёніка, а ў яго пачак цыгарэт.

Баба Зена. Ды што — цагарэты! Мая ўнучка раніцай прыйшла дамоў. Гэта ў пятнаццаць гадоў! Пытаюся: дзе была? Маўчыць...

Баба Тоня. Ой-ёй. Штой-та будзе?..

Баба Зена. А ў мяне навіна ёсць, добрая навіна! Помніце, я гаварыла пра мужчыну-адзінца, што не п'е, не курыць? Усё пра яго даведалася! Жыве адзін у двухпакаёўцы, шукае сабе гаспадыню. І па ўзросце табе, Каця, — самае-самае тое. Хочаш — да яго пад'едзем, пазнаёмімся, хочаш — ён сюды прыедзе. Усё ўжо абгаворана. Скажу проста: прыгожы дзед! Калі б я на тваім месцы... Ды што казаць! Сёння такія дзяды студэнтак бяруць. Не дзед, а падарунак на канец жыцця.

Баба Каця. Чаму — на канец? Я яшчэ пажыву.

Баба Зена. То я жартам. Ну дык што? Пенсія ў яго харошая. Зноў жа, не курыць і не п'е — у рот не бярэ.

Баба Каця. Ды няўжо... Хай бы і пакурыў... ды і выпіў кроплю... Галоўнае, каб добра закусваў.

Баба Зена. Дык што мне яму адказаць? Як табе прапанова?

Баба Каця. Прапанова цікавая... Прапанова цікавая, але ж куды падзець Маню і Ваню?

Баба Зена. Як куды? У Ждановічы.

Баба Каця. Столькі гадоў яны мяне кармілі, а цяпер?.. Не ўжо, будзем жыць разам да апошняга, пакуль не прыедзе бульдозер ламаць дом...

Вядоўца. Дом! Які дом! Хатка на курыных ножках! Ужо павалілася на той бок, дзе ганак, быццам вінавацілася перад людзьмі за сваю старасць і слабасць. Дзверы і вокны перакасіліся, дах — адны дзіркі. Толькі і ёсць, што печка, ды і тая грэе адзін бок...

Баба Каця. Вось каб ведаць, што ў гэтага старога ёсць грошыкі... Але ж у старасці людзі часта становяцца скупымі. Ёсць грошыкі, а не дасць. Спаць бу-

дзе на іх, памрэ, а не прызнаецца, дзе хавае... Я таксама стала сквапнай. Відаць, так і павінна быць. Урэшце, скупасць не дурасць, яна абарона чалавеку. Ёсць у кожнага апошні, а таму найважнейшы клопат, і каб скончыць з ім, патрэбны грошыкі, тады і паміраць прасцей. Менавіта так: трэба грошы, каб добра памерці. Вось толькі ёсць у мяне яшчэ адно, акрамя таго, каб памерці, — важнае, важнейшага не бывае.

Вядоўца. Тут, ля возера, калісьці была вёсачка, тут баба Каця і жыла ўсё жыццё, але ж год таму апошнія насельнікі пакінулі яе: за бугром, за сто-дзвесце крокаў, ужо даўно грымеў велізарны горад. Усім былым насельнікам выпісалі добрыя кватэркі, а каму і кватэрышчы, усе пераехалі, са слязьмі і песнямі, грэюцца цяпер і ўзімку, і летам. І Зоська, сяброўка яе, пераехала. Казала — ні за якія грошы не паеду, а пераехала. Яна ёй адразу казала: куды ты дзенешся! Пераедзеш! І пераехала.

Баба Каця. Цёплы, чуваць было, дом. Вось бы ўшчаміцца ў такі на ўсю зіму, у які-небудзь цёмны куточак, ды і сядзець, як мыша, да самае вясны!.. Я таксама магла б — са слязьмі ды песнямі, мне таксама выпісалі кватэрку, але ж прыйшоў сын, сказаў: «Ратуй, матка. Прапаў я, зусім прапаў». Грошы яму былі патрэбны, шмат грошай, — давялося кватэрку прадаць. Я і не пабачыла яе ні разу, і грошай тых не бачыла, усё забраў сын. Аднак усё роўна не хапіла, збег сын на край зямлі, каб жыць, толькі адзін ліст даслаў без зваротнага адраса, але тое неістотна, галоўнае — жывы, сустрэнемся калі-небудзь. Вось тады і спатрэбяцца грошыкі, што збіраю для яго, каб аддаў людзям, ад якіх уцякаў. Ого, грошыкі! Час такі, што і жыццё можна купіць, і смерць прадаць. Грошыкі — асабліва ў вялікім горадзе — гэта ўсё.

Вядоўца. Лета выдалася адметнае, цёплае і не надта дажджлівае, Яна паставіла тазы і вёдры там, дзе працякаў дах, — і нішто, памалу жыла.

Людзі здзіўляліся, калі бачылі Яе тут. Лічылася, што тут ужо даўно ніхто не жыве. Неяк завітаў мажны мужчына, мяркуючы па чэраве — вось-вось папружка папалам — начальнік, запытаўся неўцямна: «Ты што, бабуля, жывеш тут?» Ага, так Яна яму і прызналася. «Я? — здзівілася. — Што вы?.. Я — там», — махнула рукой за бугор. Доўга смяялася, калі ён знік. Ведае, як з імі, начальнікамі ды камандзірамі, размаўляць.

Дарэчы, бульдозер аднойчы ўжо прыязджаў. Малады хлопец працаваў на ім, прыгожы, рыжыя кучары стаўбуром. Дамок Яе прытуліўся на краі вёсачкі — на яго і нацэліўся. Але ж як толькі рушыў, Яна паўстала на дарозе, замахала рукамі. «Эй! — залямантавала. — Здурнеў? Дзяржаўная ўласнасць! Турма табе! Канфіскацыя!» Трактарыст доўга азіраўся па баках, мацюкаўся, пляваўся ды, нарэшце, з'ехаў.

Баба Каця. Часам мужчынкі частуюцца віном ці гарэліцаю пад ліпкай побач з яе хацінкаю, потым бутэлькі нясуць мне. «Здасі, бабуля». Я бутэлькі бяру, не тлумачу, што ў мяне ёсць каза, а бутэлькамі я не займаюся. Бывае, нават пакінуць віна ці гарэлкі на дне. «Глынеш, маці?» А мне смешна. «Глыну!» — «Колькі табе гадоў, бабуля?» — «Сто!» — я смяюся, і яны рагочуць. «Малайчына! — кажуць. — Пасля авансу зноў прыйдзем. Жыві!» Калі віно салодкае — выпіваю, калі гарэлка — пераліваю ў другую бутэльку: надта хораша для націркі перад сном, як баляць ногі, а нанач яны моцна непакояць.

Бутэлькі я аддаю маладому бамжу, што кожны дзень прабягае тут. Любых размоў ён пазбягае, акрамя бутэлек яму нічога не трэба. Весела мне пазіраць на яго: міліцэйскія штаны, жаночая кофта, капялюш з шырокімі палямі, — а бомж сярдуе: «Чаго лыбісся?» — «Прыгожы ты!» — «Вось дурніца», — не зга-

джаецца бомж. Бутэлькі, аднак, забірае. А дзякуй сказаць — не, ніколі. Зрэшты, мне дзякуй не трэба.

Вядоўца. «Чаго лыбішся, смяешся, рагочаш-хахочаш?» — гэта пыталіся ў Яе людзі ўсё жыццё. Яна ўсміхалася і не адказвала. Як адказаць? Не сумна Ёй, нават весела — вось і лыбіцца. Ці ж забаронена? Не.

«Паплач, Каця, лягчэй будзе», — гэта Яна таксама чула ўсё жыццё. Можа, Яна і плакала, толькі ніхто таго не бачыў. А навошта ім бачыць? Бачылі іншае: слёзы градам, а Яна ўсміхаецца. «Ты, пэўна, і ў труне ўсміхацца будзеш», — сердаваў муж Яе, Іван. «Што-што, а вось плакаць сапраўды не буду», — усміхалася. А колькі паўсміхалася, як зразумела, што ні грошай, ні кватэры, ні сына? Сыпала, як гарохам.

А як прапалі грошыкі ў дзевяноста першым? Дзесяць гадоў збірала-адкладвала для ўнучачкі па капейцы-рубліку, спадзявалася: будзе выходзіць замуж, а Яна ёй — на! На персцянёк ці сукенку.

Адабралі! Абабралі!

Баба Каця. Ішла я тады з ашчаднай касы дамоў, падняўшы вочы да неба, каб не праліваліся. «Што ж вы такое зрабілі? — думала. — Навошта вам мае грошыкі?» Потым... Ды што ўспамінаць? Знік сын, а праз год Клава, жонка ягоная, знайшла другога дый пакаціла з ім, з унучачкай, куды — ведае Бог. Прыйшла, а іх няма. Іншыя людзі жывуць. «Што вам, бабуля?» — «Не, нічога». — «А чаго ўсміхаецеся?» А як не ўсміхацца? Весела жыць.

Вядоўца. Трэцяя пакупніца малака, жанчына сур'ёзная. Маўклівая, нават пахмурная. Бачна — дзелавая. Ніхто нічога пра яе не ведае, а як з'яўляецца — змаўкаюць, быццам не даюць веры ці пабойваюцца. Каму купляе малако, ці сабе, ці дзецям, не кажа. За тое і ганяць, нельга так: прыйшоў-пайшоў. Трэба слова мовіць ці хаця б пастаяць з людзьмі хвіліну. І хада ў яе дзелавая: раз-два. Аднак сёння і яна загаварыла.

Трэцяя пакупніца. Дзе вы жывяце, бабулька? Сям'я ў вас ёсць?

Баба Каця. А як жа, вось яна — Маня і Ваня.

Трэцяя пакупніца. Не, вы жартуеце, а я сур'ёзна.

Баба Каця. І я. Я ўвогуле ніколі не жартую. Якія жарты на васьмідзясятым годзе жыцця?

Трэцяя пакупніца. Я магла б дапамагчы Вам у дом састарэлых.

Баба Каця. Састарэлых? Ну што вы, жанчынка! Я яшчэ маладая!

Трэцяя пакупніца. Што вы ўсміхаецеся? Я сур'ёзна.

Баба Каця. І я.

Трэцяя пакупніца (*пацепнула плячыма, аддае грошы*). Але ж Вы падумайце. Харошы дом. Я была там з інспекцыяй: яда смачная, абыход культурны.

Баба Каця. Не, нам такая ідэя не падыходзіць. Тут мы амаль што ў цэнтры горада, жыццё віруе, а там?

Трэцяя пакупніца сыходзіць. Усе моўчкі глядзяць ёй услед.

Баба Каця. Відаць, пакрыўдзілася. Чаго?

Баба Тоня. Няхай бы сама — у састарэлых!

Баба Каця. Дык яна яшчэ маладая.

Баба Тоня. Якая — маладая? Гадкоў пяцьдзясят ёсць? Хутка ўжо, хутка...

Баба Каця. А вось і Ліда-Лідуся!

Паяўляецца чацвёртая пакупніца.

А я ўжо думала — не прыйдзеш.

Ліда-Лідуся. Дзякуй богу, паспела! Я ж цяпер на дзвюх работах стараюся, спіна мокрая, валасы дыбарам. А без Вашага малака мне нельга. Вы ж ведаеце, я не сабе купляю — дачушцы. Кроў у яе дрэнная, а малачко памагае, толькі піць яна не хоча, кожны глыток са слязьмі... Маскоўскія сваякі прапануюць везці яе ў Маскву, магілёўскія — у Магілёў. Быццам ёсць у Магілеве моцны экстрасэнс... Ох, не знаю — не ведаю. Вось зараблю грошай, павязу і ў Маскву, і ў Магілёў.

Баба Тоня. А гаспадар твой былы — што? Памагае ці не?

Ліда-Лідуся. Які ён гаспадар? Тры гады як развяліся — даняў ён мяне сваёй дзікунскай рэўнасцю. Дый цяпер... Два гады за бойку адседзеў у аршанскай турме — самы спакойны час быў для мяне. Цяпер цікуе па вечарах ля дома. «Убачу, — кажа, — з ухажорам, заб'ю абаіх». І заб'е! *(Рагоча.)* Такое ў яго каханне вар'яцкае! А як мне без ухажораў? Я жанчына маладая, прыгожая! Мужчыны проста стогнуць, як я іду па вуліцы.

Жанчыны смяюцца.

Баба Каця. Ох, Лідуся, ой, глядзі-азірайся!.. Свет цяпер такі страшны...

Ліда-Лідуся. Адзін прыліп і кажа: я за цябе душу выму і сэрца аддам! Не, наадварот: я за цябе сэрца выму і душу аддам. Інтэлігентны такі мужчынка. Вельмі прыгожа гаварыў.

Баба Тоня. А грошай яшчэ не прасіў? Цяпер такіх інтэлігентаў многа: ты мне грошы, а я табе сэрца.

Ліда-Лідуся. Ага, дзе сядзе, там і злезе... А яшчэ адзін ліпучы кажа: я табе рамонт зраблю, прапішы мяне ў сваёй кватэры.

Баба Тоня. Во-во! Сцеражыся!

Ліда-Лідуся. Не хвалюйцеся. Мяне столькі разоў падманвалі, што я нават дзяржаве не веру.

Баба Каця. Ну, а што бацькі твае? Жывыя?

Ліда-Лідуся. Ды дзякуй богу. Яшчэ і бульбачкі мне дасылаюць, і яблыкаў. Ды не ўсё добра: дах працякае. Як навальніца — аж цурчыць. Брацянік у мяне ёсць, але ж ён цяпер у войску. Звярталася маці ў сельсавет, хадзіла да дырэктара саўгаса — дарэмна. Ківаюць галовамі, а нічога не зрушваецца.

Баба Тоня. Брацянік у войску — дык напішы ў ваенкамат. Ці якому дэпутату. А то і самому Прэзідэнту. Няхай падкіне гарачых. Во зашавеляцца!

Ліда-Лідуся. А што, і напішу!.. Ну, пара мне дамоў, дачка чакае. Бывайце, бабанькі.

Баба Каця і баба Тоня. Бывай, Лідуся, бывай.

Баба Тоня. Вось наша жыццё. Каго падманваюць, хто сам падманвае.

Баба Каця. Хто задаволены, хто не. Ёсць такія, каму шчасце выпадзе, а ён бурчыць: малавата. Сяброўка мая Зоська, да прыкладу. Жыве пры дзецях, пры ўнуках, ніхто не п'е, не б'ецца, кватэру атрымалі — кватэрышчу, а яна: лепш і не жыла б, кажа. Як гэта — лепш? Што ты, Зоська! Жыць хораша!.. Або так: пажыць трохі на белым свеце, што ні кажы, цікава. Што, не так? Ну, не ведаю. Мне цікава.

Вядоўца. Бясспрэчна, цікава, думала Яна, калі вялікі грузавік з пажыткамі Зоські павольна пакаціў да вялікай дарогі. Зоська вытыркнулася ў брызентавае акенца і ўсё махала, махала рукой. Не, усё ж яна памылялася. Жыць можна! Во толькі каб дамок які далі або кватэрку якую — кватэрышча Ёй не трэба!.. Аднак цяпер нічога нікому не даюць, усё купляць трэба. І дзе ты возьмеш такое вялікае купіла? Дзе?

ПАЭЗІЯ

# Наталля Жылевіч
# ДУША ЗАСТАНЕЦЦА

*Вершы*



***Жылевіч Наталля Фадзееўна*** нарадзілася 4 жніўня 1970 года ў вёсцы Каліварыя Валожынскага раёна. Закончыла Беларускі завочны сельскагаспадарчы тэхнікум, затым атрымала педагагічную адукацыю ў Рэспубліканскім інстытуце прафтэхадукацыі. Працуе кіраўніком народнага калектыву літаратурна-мастацкага майстэрства «Рунь» Валожынскага раённага цэнтра народнай творчасці. Аўтар зборніка вершаў «На беразе мараў» (2024).

◆ ◆ ◆

Спатканне згарае ў пажары рабіны,
Вятры спавіваюць туман,
Мне кружыць слязой срэбнай дождж успаміны
Пра твой вераснёвы падман,

Дзе словы, як песні, як казкі ліліся,
І вечар узносіў да зор.
Карункі ў дзявочыя строі ўпляліся —
Вясельна-шчаслівы узор.

Пярун ды вятры мае мроі парвалі,
На сэрцы пякло крапівой.
І зоркі кахання з нябёсаў прапалі,
Сказаў: «Ты была мне чужой...»

Чужой... Калі крочылі побач у марах,
І вусны шапталі «Люблю!»
Чужой... Журавы недзе ў восеньскіх хмарах,
Спявалі мне песню тваю.

Упарта прашу я свой клін жураўліны:
«Нясі ў вырай боль, непакой.
На сэрцы маім ты застаўся адзіным,
А я для цябе —
буду вечна чужой».

◆ ◆ ◆

На беразе мараў
У ціхім куточку
Душа дагарала
Асеннім лісточкам.

І думкі, і словы
Ў вяночак віліся,
І шчэбетам птушак
Малітвы ліліся.

Душа дагарэла,
І зорка патухла,
А ў коміне вецер
Так свішча натужна.

Душу з неба кліча,
Туман даганяе,
На вогнішчы памяць
Рабінай згарае.

Патонуць у водах
І мары, і мроі —
Душа застанецца
У вечным спакоі.

◆ ◆ ◆

Памяць
Туды мне пракладвае сцежку,
Дзе лозы схілілі галовы,
Дзе свежы пакос на абмежку
І песні пяшчотныя словы.

Замець,
І ранку сцюдзёнага вецер,
І свіст уначы завірухі,
Дзе ў фарбах стракатая квецень
І позняга вечара скрухі.

Ночка
Ліхтар то запаліць, то гасіць —

Зноў памяць жартуе да ранку:
Бабуля капусту заквасіць,
І дзед пастаіць каля ганка.

Шчасце,
Што песні шчабеча салоўка,
Шаўковы мурог сенажаці,
Ды босыя ногі ў радоўку
І дым па-над хатай, дзе маці.

Сумна...
Травеюць старыя дарогі,
Рачулку пяскамі занесла.
І толькі чакаюць парогі
Вяртання майго да маленства.





Уладзімір Васько

# ЧАТЫРЫ АПАВЯДАННІ

***Васько Уладзімір Гаўрылавіч*** нарадзіўся 2 студзеня 1937 года ў вёсцы Ліпічанка Шчучынскага раёна. Служыў у войску на Поўначы. Скончыў Гродзенскі педінстытут імя Янкі Купалы. Працаваў у рэдакцыях раённых газет Шчучына, Дзятлава і Ліды. Жыве ў Лідзе. Аўтар кніг «Прасветленасць» (1981), «На схілах берагоў» (1997), «Кругаварот жыцця» (2011), «Лясная рапсодыя» (2013), «Зігзагі лёсу» (2017), «Энергія душы» (2018), «На перавалах часу» (2021), «Неабдымнае» (2023).

## ЗДАРАВЯКА

У нашай вёсцы раней клуба не было — і вечарынкі, і танцы праводзіліся па чарзе па хатах. Дайшла такая чарга і да нас. Тады мала ў каго мелася дашчатая падлога. У нашай хаце таксама быў звычайны, добра ўтрамбаваны гліняны ток. Перад танцамі яго шчодра апырсквалі вадой, каб не пыліў, напаілі і накармілі музыку Косціка Дзякевіча, сабралася моладзь — і вечарынка распачалася.

Мне, дапытліваму падлетку, прыемна было назіраць, як дужыя хлопцы і гарэзныя дзяўчаты віхурацца ў вясёлых беларускіх польках ці ў плаўных вальсах. Як звычайна, гарманіст, каб крыху адпачыць, цераз некаторы час абвяшчаў перапынак — тады хлопцы збіраліся ў кола і пачыналі спрачацца. І на гэты раз мажны, дужы, шыракаплечы Мікола Аленчык выйшаў на сярэдзіну кола і прапанаваў:

— Хто хоча са мною паспрачацца, што я падыму ў зубах мяшок бульбы?

— Я, — адгукнуўся таксама не са слабакоў Ваня Чучва. — На што спрачаемся?

— На бутэльку гарэлкі.

— Згода.

Мяне папрасілі схадзіць у камору і набраць вялікі мяшок бульбы. Я паслухмяна патэпаў і ў катуху невялікім кошыкам заграбаў клубні і засыпаў у мяшок. Калі ён быў амаль запоўнены, вярнуўся ў хату і сказаў:

— Гатова. Можна забіраць. Пайшлі.

Аленчык і Чучва рушылі за мною. У каморы Аленчык страсянуў мяшок, каб лепш асела бульба, моцна завязаў завязкай. Унеслі ў хату, паставілі каля парога, дзе стоўпіліся ўсе хлопцы і дзяўчаты. Што будзе? Ва ўсіх пашырыліся зрэнкі.

Аленчык з хвіліну пастаяў у роздуме. Пасля ўздыхнуў, нагнуўся, сціснуў зубамі мяшок вышэй ад завязкі і рукамі паказаў натоўпу расступіцца, даць прайсці. Сагнуўшыся, ён данёс у зубах мяшок да супрацьлеглай лавы, што стаяла пры ўсходняй сцяне, і вярнуўся назад. Усе вохнулі, паглядзелі на Аленчыка як на сапраўднага асілка: у мяшку было не менш за пяць пудоў бульбы.

— Зубы цэлыя? — спытаў Віталь Казілаўка.

— Усе на месцы. Ніводзін не зламаўся, — адказаў Аленчык.

Ваня стаяў з апушчанымі рукамі: ён пацярпеў фіяска.

— Ну, што задумаўся? Бяжы па бутэльку.

— Давядзецца. Прайграў. Давай аднясем мяшок у камору.

— Бяжы. Я адзін з гэтым спраўлюся.

Чучва пайшоў па вёсцы шукаць самагонку.

Аленчык папрасіў мяне паадчыняць дзверы, узяў на выцяжку рук, каб не запэцкаць белую кашулю, за два канцы мяшок, занёс у камору і высыпаў бульбу ў катух.

Праз некалькі хвілін вярнуўся Чучва. Ён штурхнуў Аленчыка ў плячо, кіўком галавы паказаў ісці на кухню. Айчым расставіў шклянкі, мама нарэзала сала, каўбасы, хлеба. Паклікалі гарманіста. На чатырох чалавек адна бутэлька асаблівага знаку не дала, тады айчым прынёс з каморы паўтаралітровую цёмную масіўную бутэльку сваёй самагонкі.

— Хоць я з табой і не спрачаўся, і не прайграў, — прамовіў ён, звяртаючыся да Аленчыка, — але раз ты такі здаравяка, то ў твой гонар частую вас уласнай самагонкай.

Аленчыку ён наліў поўную шклянку — і той залпам апаражніў яе.

— Не акасееш? — пацікавіўся Косцік Дзякевіч.

— Што для мяне гэта значыць?! Я магу тры шклянкі зараз выпіць.

— Здаравяка.

Мужчыны з зайздрасцю паглядзелі на Аленчыка. А на яго самагонка як быццам бы і не падзейнічала. Толькі неяк выразней пасвятлелі вочы, пачырванеў твар, больш развязаўся язык.

— Я магу каня падняць, — пахваліўся сваёю сілаю Аленчык.

— Ого! — усклікнуў Дзякевіч.

— Дзядзька, дазволіш пакарыстацца сваім канём?

— Калі ласка, — адказаў айчым.

А на зале ў гэты час сядзела на лавах, на ложках, на зэдліках моладзь, гучна гаманілі хлопцы, прывабна хіхікалі дзяўчаты.

На кухні Дзякевіч занепакоіўся:

— Пара, хлопцы, мусіць закругляцца. А то зараз мяне абвінавацяць у гультайстве.

— Ну, давайце тады аглаблёвыя, — прапанаваў айчым і разліў па шклянках усю да кроплі гарэлку, якая на гэта раз дала пэўны штуршок у арганізмах мужчын.

Госці пайшлі ў залу. Весялей і больш па-заліхвацку зайграў на гармоніку Косцік. Зноў усчалася завіруха сукенак, кашуляў, прычосак, рук, ног.

Доўга танцавалі, пакуль не стаміўся музыка. Ён перастаў іграць, паварушыў у паветры пальцамі, даў слабіну рукам.

Па-новаму апырскалі халоднай вадой гліняную падлогу. І тут на круг выйшаў Аленчык:

— Хто гатовы памерацца са мною сілаю?

Ахвотнікаў не знайшлося.

— Тады ці ёсць сярод вас смяльчак паспрачацца са мною? На гэты раз я падніму каня.

— Ого!

Усе маўчалі. І тут з натоўпу прабілася да Аленчыка шатэнка Юлька Герасімчык, ружавашчокая, чарнабровая, фігурыстая. Яна працягнула яму руку і тоненькім галаском сказала:

— Я гатова.

Аленчык сціснуў яе маленькую лагодную ручку сваёй магутнай «лапай» і спытаў:

— На што спрачаемся?

— На бутэльку.

— Дурная, — зашапталіся ў натоўпе дзяўчаты. — Знайшла на што спрачацца. Хоць бы на кілаграм цукерак. Нас пачаставала б. Усё роўна ён прайграе. Падняць каня? Гэта не жарты...

— Пайшлі на двор! — моцна выгукнуў Аленчык. — Дзядзька Восіп, ідзі выведзі з хлява каня.

Шумны, гаманкі натоўп выкаціўся з хаты. Айчым зняў са сцяны падпаветкі аброць, два путы, вывеў на двор каня. Сівы, дагледжаны, пакладзісты, разумны, ён стаяў сярод панадворка, спакойна пазіраючы на людзей, не цямячы, што тут адбываецца. Айчым звязаў яму путамі дзве пярэднія і дзве заднія нагі, сам узяўся за аброць, каб сівы стаяў на месцы і нікуды не рухаўся.

— Можаш пачынаць.

Аленчык падлез пад жывот каня, абняў яго за пярэднія і заднія ногі і падняў угору, трымаючы вялікі жывы груз на сваіх плячах і карку.

Нехта выкрыкнуў:

— Ура!

Конь быў адарваны ад зямлі на паўметра, не брыкаўся і не рухаўся. Аленчык патрымаў яго на сабе і апусціў уніз. Ніхто не паверыў сваім вачам. Аднак гэта была вялікая перамога Аленчыка.

Дзяўчаты зноў зашапталіся:

— Дурная. Няхай бяжыць цяпер па гарэлку.

І Юлька памкнулася ісці, але Аленчык наблізіўся да яе і сказаў:

— Не трэба. Нікуды не хадзі. Я дарую табе пройгрыш. Хвалю за смеласць.

Юлька апусціла вочы.

Некаторы час моладзь пабыла на падворку, рухалася туды-сюды, збіралася ў групкі, гаманіла, выходзіла на вуліцу, адпачывала. Айчым адвёў Сівога ў хлеў, музыка, Аленчык і Чучва прыселі на прызбу і прыкідвалі, колькі мог важыць конь.

— Не менш, як семсот кілаграмаў, — меркаваў Аленчык. — Цяжкі, халера, але ж не мог я не падняць яго, апраставалосіцца перад публікай. Хоць гэта калі-небудзь, можа, і адаб'ецца на маім здароўі.

...Спакваля пачынала цямнець. Сцішыўся і заснуў у шатах дрэў ветрык. На ўсходнім небасхіле запаліліся першыя зорачкі. Хлопцы і дзяўчаты, не спяшаю-

чыся, заходзілі ў хату, якая зноў напоўнілася музыкай, шумам, стукам абцасаў, вясёлым смехам, гаманой.

Танцы доўжыліся аж да поўначы. Аленчык праводзіў Юльку, якая жыла ў самым канцы вёскі, дадому. Спыніліся каля веснічкаў.

— Як гэта ты адважылася са мною паспрачацца.

— Я паглядзела, што ўсе хлопцы маўчаць, стаіліся і вырашыла: што будзе, тое будзе — рызыкнула, выйшла да цябе.

— Правільна зрабіла.

Аленчык паглядзеў Юльцы ў вочы — у іх трапяталі, пераліваліся іскрынкі ад таямнічага месяцовага святла. Ён ласкава абняў дзяўчыну і пацалаваў. У яго магутных руках яна стаілася цёплым, рахманым птушанём, якое яшчэ не навучылася лятаць. Некалькі хвілін яны стаялі і маўчалі, прытуліўшыся адно да аднаго. Пасля Юлька разняла рукі Аленчыка і беглым позіркам прайшлася па хаце. У акне ад панадворка матлянулася фіранка і паказаўся твар маці, якая памахала рукою — падала дачцэ знак, каб ішла дахаты. Аднак Юлька пра гэта Аленчыку нічога не сказала і працягвала далей быць разам са сваім кавалерам.

— Чаго ты спрачаешся з хлопцамі толькі на гарэлку, а не на што іншае?

— Ну, не буду ж я з імі спрачацца на рублі ці цукеркі. Гэта не мужчынская заманка.

— То хоць на пуд жыта...

— Насмяшыла. Буду я яшчэ валаводзіцца з жытам...

Аленчык зноў абняў Юльку за плечы і моцна прыціснуў да сябе. Яна войкнула. І тут пачуўся стук кулака ў акно. Аленчык агледзеўся — барабаніла ў шыбіну маці Юлькі.

— Кліча дахаты?

— Ага. Пайду, бо яна не ўгамоніцца.

Развіталіся без абдымкаў і пацалункаў. Ідучы дадому, Аленчык думаў: «Трэба ўсё-ткі жаніцца з Юлькай. Здатная, мілая дзяўчына, спрытная, рахманая. Мабыць, яе маці можа паўстаць супраць: яна ведае мае слабасці. Але тут галоўны ігрок не яна, а яе дачка».

Сустрэчы іх працягваліся. Перад Новым годам Аленчык запрасіў Юльку ў сельсавет, дзе яны і распісаліся. Жылі ў хаце бацькоў Юлькі, у баковачцы — асобным пакойчыку, дзверы якога адчыняліся ў сені. У сям'і панавалі згода і памяркоўнасць. Аленчык перастаў выпіваць.

Аднак у 1949 годзе стварыўся калгас імя Дзяржынскага і бясхлебіца пераступіла цераз парогі хатаў. Хлопцы і дзяўчаты, мужчыны і жанчыны хадзілі на розныя работы, якія выпадалі на іх долю.

Неяк пад вечар Аленчык з Ванькам Чучвой, змардаваныя, запыленыя з ног да галавы, валакліся дадому ад малацілкі, у якую яны падавалі снапы ячменю.

— Нічога не браў? — спытаў Ванька.

— Не.

— А я во ўсыпаў у кішэнь жменю зярнят. Хоць курам будзе які пачастунак, знясуць, можа, яйка на сняданне.

— Ты што?! — расхваляваўся Аленчык. — Зловяць — пасадзяць у турму. Цяпер жа ўстаноўка, каб ніводны каласок нідзе не прапаў, ніводнае зернетка.

— Ну і напалохаў ты мяне, цяпер нічога не буду браць. Але якія ў нас, братка, заробкі: трыста грамаў збожжа на адзін працадзень. Ды і якое збожжа?

Трэцяга гатунку, амаль смецце. За год заробіш пару пудоў, прынясеш на плячах дадому — і паспрабуй пракармі сям'ю. Паслухай, давай махнем на заробкі ў Жалудок.

— Куды?

— На спіртзавод.

— Не пусціць жонка. Скажа: «Зноў улезеш у п'янку».

— А ты паспрабуй яе ўгаварыць. Усё-ткі будзем атрымліваць рублікі. А за грошы ўсё можна купіць.

— Падумаю.

Юлька асабліва не пярэчыла, толькі папярэдзіла: «Трымайся».

Праз некалькі дзён Аленчык і Чучва патэпалі ў Жалудок. Дырэктар спіртзавода Пінчук становуча ацаніў іх мажныя постаці і спытаў:

— Грузчыкамі пойдзеце?

— Пойдзем, — у адзін голас згадзіліся дзецюкі.

— Можаце заўтра выходзіць на работу. Заадно напішаце тут заявы, і мы афомім прыём.

Аленчык і Чучва абрадаваліся.

Прыемная вестка ўзбадзёрыла дома і Юльку.

А на другі дзень Аленчык і Чучва, на хуткую руку перакусіўшы, пашыбавалі ў Жалудок. На спіртзаводзе іх прынялі на работу. Толькі дырэктар, строгі і надзьмуты, папярэдзіў:

— Глядзіце, каб ні адзін грам спірту не трапляў вам на язык. Бо калі ўбачу п'янымі, зачыніце дзверы з адваротнага боку.

— Мы не выпіваем — такі далі самі сабе зарок.

— Малайцы. Ідзіце да майстра. Ён вам скажа, што патрэбна рабіць.

У двор у гэты час якраз заехалі дзве машыны: адна з бульбай, другая з жытам. Майстар Красочка, які паспеў ужо з грузчыкамі пазнаёміцца, сказаў:

— Разгружайце абедзве машыны. Мяшкі насіце вунь ў той склад, у якім адчынены дзверы.

Узяліся перш-наперш за бульбу. Чучва ўскочыў у кузаў і падаваў груз Аленчыку. Аленчык браў мяшок пад паху і, як лёгкую торбу, нёс у склад, дзе кладаўшчыца ўзважвала яго і паказвала, куды паставіць. Гэты шыракаплечы бамбіза здаўся ёй добрым і паслухмяным, і як толькі ён выйшаў за дзверы, яна выглянула са склада, каб ацаніць другога грузчыка: Чучва таксама быў дужым і паскладзістым. «Вось гэта работнікі, — падумала яна. — Не тое, што тыя былі, — і выпівохі, і слабакі. Пінчук зрабіў правільны выбар».

Мяшкі з бульбаю і жытам хлопцы разгрузілі даволі аператыўна і хутка. Пасля насілі вялізныя зялёныя бутлі з гатовай прадукцыяй — спіртам на склад. І ў канцы дня кладаўшчыца пры глыбокай тайне прапанавала асілкам па чарцы спірту.

— Не, не і яшчэ раз не, — адказаў Аленчык.

— Мы не выпіваем, — падтрымаў яго Чучва.

Кладаўшчыца абсела:

— Можа, і правільна робіце.

Праца хлопцам пры іх сіле не была надта цяжкай. Яны заўсёды ў добрым настроі, з чыстымі галовамі крочылі дадому і радаваліся, што нарэшце знайшлі пастаянны занятак для сваіх рук.

Такія-сякія грошы пацяклі ў сем'і. Юлька проста скакала ад радасці.

Аднак мінуў адзін месяц, другі, трэці — і распачалася зіма. Сыпкі снег перамятаў дарогу, кусаліся лютыя маразы. Топаць пешшу восем кіламетраў ад Жалудка да Ліпічанкі было няпроста, ды і цяжкавата.

Майстар Красочка разумеў гэта і вырашыў хоць як матэрыяльна падтрымаць хлопцаў. Аднойчы пад вечар ён выдзеліў ім на дарогу па чакушцы спірту, даў па скібцы хлеба. Яны зайшлі ў Жалудку да аднаго знаёмага, выпрасілі пустую бутэльку, набралі вады. Пяцьдзясят грамаў улілі гаспадару за сустрэчу і цёплы прыём. Рэшту з адной чакушкі дапілі самі, другой не распачыналі.

Рушылі ў дарогу, калі ўжо добра сцямнела. У Лапішках — лясным масіве паміж Жалудком і Ліпічанкай — спыніліся.

— А што мы гэтую кроплю панясем дахаты? — прамовіў Чучва. — Давай дап'ем тут.

Аленчык дастаў з-за пазухі другую чакушку. А якраз усхадзілася моцная завея — яна і падштурхнула хлопцаў на нядобрае. Пілі па чарзе з рыльца, не разбаўляючы, запівалі халоднай сырой вадой, закусвалі сухім хлебам.

— О, цяпер добра, — сказаў Чучва.

— Няблага.

Цераз пару кіламетраў зноў спыніліся і працягнулі «банкет». Падыходзячы да вёскі, дапілі рэшту.

— Дасць Юлька наганяю, калі агледзіцца, — захваляваўся Аленчык.

— А ты блізка не падыходзь да яе, каб не абнюхала, — параіў Чучва.

— Спірт не пахне.

— Тым больш. А так па табе не вельмі заўважна. Не хістаешся.

Дома Юлька не западозрыла мужа ў выпіўцы — і ніякай сваркі не ўчыніла. Аднак менавіта з гэтага вечара ўсё і пачалося.

Цяпер грузчыкі ўжо самі выпрошвалі ў майстра і кладаўшчыцы, каб выдзелілі ім хоць мізэрную кроплю спірту на дарогу. А калі просьба не задавальнялася, умудраліся неяк украсці. Як кажуць, пайшло-паехала. Алкагольная багна паступова засмоктвала грузчыкаў. Ужо Юлька беспамылкова «раскусвала» мужа, калі ён прыходзіў дадому п'яны.

На заводзе, праўда, і Аленчык, і Чучва не выпівалі: баяліся, што Пінчук звольніць іх з работы. Трымаліся з усіх сіл. А вось у дарозе давалі сабе волю і ўжывалі спірт без усякай меры. Іншы раз, калі забываліся набраць вады, запівалі-заядалі нават снегам. Непрыемна было, але што зробіш: спірт мог апаліць і язык, і паднябенне, і страўнік. Снег тушыў «агонь».

Неяк у хату Юлькі завітаў сусед, пажылы мужчына Алесь Кучэйка. Якраз яна, бацька і маці, уключыўшы святло, сядзелі ў зале.

— Твой у Лапішках з Ванькам, — звярнуўся ён да Юлькі, — па курганах валяюцца. Я не даў рады дацягнуць іх дадому: цяжкія, абвялыя. Трэба штосьці рабіць, бо змерзнуць у лесе.

— Тата, схадзі, можа, ты прывалачэш іх, — папрасіла Юлька бацьку, — бо я таксама не спраўлюся.

— Моцна п'яныя? — запытаў Міхась у Кучэйкі.

— Моцна. Амаль не стаяць на нагах.

— Тады, мусіць, патрэбна паклікаць яшчэ і старога Чучву.

— Пакліч, тата.

Міхась апрануў кажушок, надзеў рукавіцы і выйшаў з хаты. Было цёмна і няўтульна. Ён прыбавіў кроку.

АРХІВЫ

**Галіна Часлаўская**

# ЗАВОЧНАЕ ВЯСЕЛЛЕ, РАЗЛУЧАНЫЯ ДВАЙНЯТЫ І ІНШЫЯ ТАЯМНІЦЫ СЯМ'І ПІЛІПА ПЕСТРАКА




«— Вецер на дарогах звёў нас. Шалёны вецер. Няма нічога дрэннага без добрага...»

Так звяртаецца да любай дзяўчыны герой рамана Піліпа Пестрака «Сустрэнемся на барыкадах», у якім распавядаецца пра змаганне ў Заходняй Беларусі супраць польскай акупацыі.

У творах Пестрака шмат аўтабіяграфічнага... І гэтую рэпліку ён цалкам мог сказаць сваёй любай жанчыне, спадарожніцы жыцця.

Чалавекам ён быў неардынарным. Падчас Першай сусветнай вайны яго сям'я эвакуявалася ў Самарскую губернію, там і вучыўся, пасля рэвалюцыі нават быў студэнтам сацыяльна-гістарычнага факультэта Самарскага ўніверсітэта... Але ў Паволжы пачаўся голад, у 1921-м сям'я вярнулася ў Беларусь... І апынулася ў панскай Польшчы.

Піліп Пестрак стаў актывістам беларускага вызваленчага руху. У польскіх турмах ён правядзе адзінаццаць гадоў.

Пра шматлікія яркія старонкі біяграфіі, пра якія не прачытаеш у энцыклапедычных артыкулах і хрэстаматыях, распавядаюць архівы... Давайце разам зазірнем у дакументы з фонду Піліпа Пестрака.

## КАМЕРЫ НА РОЗНЫХ ПАВЕРХАХ

У фондзе захоўваюцца ўспаміны жонкі пісьменніка, Анастасіі Сцяпанаўны Пестрак, напісаныя ў 1985-м.

У маладосці яна таксама была ў камуністычным падполлі, змагалася супраць польскіх акупантаў ва Украіне. Была бясстрашнай і мужнай. «Аднойчы ўначы паліцыя ўварвалася ў маю кватэру, пачала весці допыт... пыталася, дзе знаходзяцца падпольшчыкі, якія ў іх паролі, задавала шмат іншых пытанняў, на якія я не адказвала. Тады яны ўжылі фізічную сілу, пры гэтым пашкодзілі пазваночнік, я згубіла прытомнасць і была паралізавана» (арыгінал на рускай мове, пераклад мой — *Г. Ч.)*

На шчасце, Анастасія вылечылася... Але гэта была не апошняя яе траўма. У 1935-м годзе было прынятае рашэнне адправіць адважную падпольшчыцу на вучобу ў партыйную школу ў Савецкі Саюз. За два дні да ад'езду, калі дзяўчына праводзіла сход у сяле, яе схапіла паліцыя. Пачаліся дні пакутаў і няскоры. У 1937 годзе рэвалюцыянерку перавялі ў гродзенскую турму.



«Ніжэй паверхам, пад нашай камерай, сядзелі нашы хлопцы. Перад сном яны таксама паўтаралі тое, што днём вучылі, а часамі распавядалі анекдоты, смяяліся. У камеры разам з Піліпам Пестракам сядзелі і іншыя беларускія пісьменнікі і паэты — Валянцін Таўлай, Якуб Міско, Радзюк. Піліп Пестрак быў вялікі аматар песень. Ён ведаў іх шмат — беларускіх, рускіх, украінскіх, польскіх. У яго быў добры голас. Як толькі ён запяваў ціхую песню, у камеры адразу ўсталёўвалася цішыня, усе слухалі, стаіўшы дыханне, нават некаторыя наглядчыкі стаялі і слухалі. Адзін з іх сказаў Пестраку, што яму трэба было выступаць у тэатры, а не сядзець у турме».

Ці не з тых песень пачалося зацікаўленне Анастасіі беларускім змагаром?

Пестрак адседжваў тэрмін пасля чацвёртага арышту. Як піша Анастасія, падчас першага арышту за пераход польска-савецкай мяжы ў паліцэйскім участку яму пашкодзілі слых, а праз некалькі дзён ён згубіў валасы. Расказваў: як правядзе рукой па галаве, у руцэ прыгаршча валасоў застаецца... Так і застаўся да канца жыцця лысы. У турме захварэў на сухоты.

Піліп вучыў вязняў матэматыцы, гісторыі, граматыцы, пісаў лекцыі, якія рассылаліся па турме. Анастасія ўзначальвала жаночы камерны камітэт. І Анастасія, і Піліп складалі вершы. Пестрак занатоўваў іх кавалачкам цэглы на цэментнай падлозе. Меў пры сабе мокрую анучу — каб, калі што, сцерці радкі... На жаль, не ўсё з тых сцёртых вершаў удалося пасля аднавіць у памяці.

## КАМСАМОЛЬСКАЕ ВЯСЕЛЛЕ Ў ВЯЗНІЦЫ

Піліп і Анастасія пазнаёміліся асабіста ў канцы 1937-га, убачылі адзін аднаго праз турэмныя краты.

«Спачатку я не надавала гэтаму знаёмству асаблівага значэння. Потым я атрымала ад яго запіску, з якой даведалася аб яго сур'ёзных намерах. Неяк ён напісаў мне, што яго вызваляюць на чатыры месяцы раней за мяне, і што ў дзень майго вызвалення ён прыйдзе мяне сустракаць, а там паглядзім, што будзе далей. Тады ён яшчэ не ведаў, што мяне чакаюць яшчэ два суды.

Цягам двух апошніх гадоў Піліп Сымонавіч заўсёды намагаўся паглядзець праз краты на мяне, калі я з іншымі жанчынамі выходзіла на прагулку.

Весці перапіску нам было вельмі цяжка, але мы ўсё-ткі знаходзілі выйсце з такога становішча. Хаця мы пісалі запіскі адзін аднаму рэдка, але ў кожнай з іх было столькі цяпла, пяшчоты і добрых пачуццяў, што ўспамінаю пра іх і па сённяшні дзень».

Дні зняволення ўсё цягнуліся... Неяк у камеру, дзе сядзела Анастасія, наглядчыкі кінулі слёзатачывую бомбу — і доўга назіралі, як вязні пакутуюць ад газу. Неяк Анастасія, як завадатарка галадоўкі, трапіла ў карцар. Выратаваў кавалачак хлеба з салам, які ёй умудрыліся перадаць.

Уяўляеце, якая была падзея для беларускіх змагароў, калі ў гродзенскай вязніцы адбылося камсамольскае вяселле! Прычым жаніх і нявеста бачыліся толькі здалёк.

Пра рамантычныя адносіны паміж дваімі зняволенымі даведалася начальства... Да Анастасіі прыйшоў наглядчык, пачаў распытваць пра беларускую інтэлігенцыю — Тарашкевіча, Дварчаніна ды іншых. Дзяўчына маўчала... *«Тады ён загаварыў пра П. Пестрака, назваў яго маім мужам і сказаў, што мы маглі б жыць у Варшаве, як прыстойныя паны. Напачатку я разгубілася, потым узяла сябе ў рукі і сказала, што сямейныя пытанні рашаюцца ў сваім доме, на што наглядчык мне адказаў: "Калі вы не пакінеце палітыку, то ваш дом — вечная турма"».*

## ПЕРШЫ ДОТЫК

Невядома, як склаліся б лёсы Анастасіі і Піліпа, але надышоў 1939 год. 17 верасня Чырвоная Армія вызваліла Заходнюю Беларусь. Вязні пачалі выломваць замкі на дзвярах камер. Пестрак стаяў ля рашоткі турэмнага калідора, калі ўбачыў сваю Анастасію і паклікаў яе, працягнуў руку праз краты. «І так упершыню нашы рукі даткнуліся адна адной».

Вязні пакінулі турму. Радасны натоўп рушыў у бок паліцэйскага ўчастка. Анастасія ішла побач з Піліпам. Пра што нават аб'явілі па радыё — нехта асвятляў падзеі анлайн: «Пестрак з жонкай ідуць у першых шэрагах».

А быў у іх усяго толькі адзін дотык рукі...

Але ўсё ледзь не скончылася трагічна... Горад зноў захапілі палякі, амаль усіх вязняў вярнулі ў турму... Пестраку прыгразілі, што будуць выпальваць зорку на спіне... А Анастасіі давялося на свае вочы пабачыць дакумент, у якім загадвалася ў ноч з 17 на 18 верасня расстраляць палітычных зняволеных жанчын на вачах у мужчын, а потым і астатніх камуністаў і камсамольцаў.

Прысуд спазніўся на сорак хвілін. Чырвоная армія зноў, на гэты раз канчаткова, вызваліла Гародню.

## ДВА ЖАЛЕЗНЫЯ ЛОЖКІ І ДЗВЕ ПАДУШКІ, НАБІТЫЯ САЛОМАЙ

Пачалося новае жыццё... Так здарылася, што Анастасія нейкі час працавала перакладчыцай у турме і ўдзельнічала ў допытах сваіх нядаўніх наглядчыц і катаў.

Яшчэ цікавы эпізод з успамінаў:

«У хуткім часе пасля вызвалення прыехалі ў Гродна беларускія пісьменнікі: Змітрок Бядуля, Міхась Лынькоў, Аркадзь Куляшоў, Пятрусь Броўка. Сустрэліся яны з Піліпам Пестраком, вядуць вясёлыя размовы, жартуюць, смяюцца, потым папрасілі Пестрака, каб вёў да сябе на кватэру. Пестрак прамаўчаў, не ведаючы, што адказаць. Яны яшчэ раз паўтарылі, і тады Пестрак вымушаны быў сказаць: «Дарагія таварышы, я яшчэ знаходжуся ў турме разам з жонкай». Яны глядзяць на яго і не разумеюць, у чым справа. Потым гавораць: «Чаму вы знаходзіцеся ў турме? Вас жа ўсіх вызвалілі!» Пестрак адказаў, што мы на волі, толькі яшчэ не маем кватэры, потым са смехам дадаў, што таму яшчэ даводзіцца даседжваць».

Літаральна на наступны дзень нядаўнім вязням вылучылі кватэру.

Анастасія ўзяла пад распіску ў турме два жалезныя ложкі, два матрацы і дзве падушкі, набітыя саломай, а таксама дзве жалезныя місы і два кубкі.

Вось і ўся маёмасць, з якой маладыя засяліліся ў двухпакаёвую кватэру.

Яшчэ ўспамін... Ішлі рынкам, Пестрак пабачыў, як нейкі мужчына прадае гітару... «Піліп Сымонавіч узяў гітару і пачаў іграць. Яго худыя змучаныя пальцы ўмела хадзілі па струнах гітары. У тую ж хвіліну яго абкружылі людзі, слухалі і глядзелі на яго захоплены і ўсмешлівы ад радасці твар.